# ПРЫМЯНЕННЕ СРОДКАЎ АХОВЫ РАСЛІН НА ПРЫСЯДЗІБНЫХ УЧАСТКАХ

Для вырошчвання добрых ураджаяў сады, ягаднікі і агароды неабходна пастаянна абараняць ад шкоднікаў, хвароб і пустазелля.

У апошні час і на індывідуальных участках для гэтай мэты побач з агратэхнічнымі і біялагічнымі метадамі аховы раслін даволі шырока прымяняюць хімічныя рэчывы. Прымяняць іх у такіх умовах трэба вельмі асцярожна, строга захоўваючы правілы выкарыстання.

На індывідуальных участках забараняецца выкарыстоўваць хімічныя рэчывы, шкодныя для чалавека, хатняй жывёлы і птушкі. Для продажу насельніцтву дазваляюцца найменш ядавітыя рэчывы, якія можна прымяняць на індывідуальных участках. Набываць хімічныя рэчывы трэба толькі ў гандлёвай сетцы. Перад пачаткам работ неабходна падрабязна вывучыць інструкцыю па кожнаму рэчыву, каб ведаць яго прызначэнне, ступень ядавітасці, спосаб прымянення і іншыя ўласцівасці. Калі ў працэсе азнаямлення з інструкцыяй ці спецыяльнай літаратурай узнікнуць пытанні, трэба звярнуцца за растлумачэннем да аграномаў або работнікаў станцый аховы раслін.

Для дастаўкі ядахімікатаў з гандлёвай сеткі неабходна выкарыстоўваць спецыяльна прызначаныя сумкі, пакеты. Захоўваць ядавітыя рэчывы трэба ў спецыяльна адведзеных месцах. Лепш за ўсё іх пакласці ў шчыльную скрынку, якая закрываецца на замок, і паставіць яе ў кладоўку. Паблізу скрынкі нельга захоўваць прадукты харчавання, ваду, а таксама корм для жывёлы і птушкі. Гэтыя месцы павінны быць недаступныя для дзяцей. Пры адсутнасці этыкетак на тары трэба абавязкова напісаць на ёй назву рэчываў. Для захоўвання ядавітых рэчываў нельга ўжываць бутэлькі з-пад напіткаў, воцату, алею, лекавых прэпаратаў і інш.

Набываючы ядавітыя рэчывы ў гандлёвай сетцы, трэба звяртаць ўвагу на цэласнасць упакоўкі або тары, на якіх павінны ўказвацца назва рэчыва і яго аб’ём. Нельга ствараць запасы ядахімікатаў. Трэба набываць іх па меры неабходнасці.

Для барацьбы са шкоднікамі і хваробамі раслін на прысядзібных участках ядахімікаты часцей за ўсё прымяняюцца ў выглядзе эмульсій і раствораў. Апрацоўкі раслін імі павінны праводзіцца з дапамогай спецыяльнай апаратуры, якая прадаецца ў гаспадарчых магазінах. 3 апаратуры часцей за ўсё прымяняецца ручная або ранцавая.

Апаратуру перад пачаткам работы трэба праверыць на герметычнасць і пры неабходнасці адрамантаваць.

Праводзіць работы па апрацоўцы раслін, як ужо адзначалася, трэба раніцай ці пасля заходу сонца, калі спадае дзённая гарачыня. Пры высокай тэмпературы адбываецца моцнае выпарэнне ядаў. Апрача таго, у гарачыню цяжка працаваць у ахоўнай вопратцы. Працягласць работы не павінна перавышаць 1 гадзіны.

Пры збіранні вьпадкова разлітых ці рассыпаных ядахімікатаў неабходна карыстацца шуфлямі і гумавымі пальчаткамі, пасля чаго пальчаткі і шуфлі добра вымыць вадой з мылам.

Пры апрацоўцы прысядзібных участкаў ядахімікатамі трэба абавязкова карыстацца сродкамі засцярогі (камбінезон, гумавыя боты, гумавыя пальчаткі, ахоўныя акуляры, рэспіратары). Для аховы органаў дыхання лепш за ўсё карыстацца універсальнымі рэспіратарамі РУ-60, РУ-60М і інш.

Ахоўная вопратка, інвентар і посуд павінны выкарыстоўвацца толькі для работ з ядахімікатамі і больш ні для якіх мэт. Катэгарычна забараняецца працаваць з пестыцыдамі падлеткам да 18 гадоў, цяжарным, кормячым жанчынам і хворым.

Непасрэдна ў час правядзення работ нельга курыць, прымаць ежу, піць — можна занесці яд у арганізм.

Пасля заканчэння работ трэба старанна вымыць з мылам рукі, твар, прапаласкаць рот, а ўвесь інвентар вымыць вадою, апрацаваць яго растворам кальцыяванай соды (300— 500 г на вядро вады) або 10-працэнтным растворам хлорнай вапны (1 *кг* на вядро вады). Можна таксама выкарыстоўваць кашку драўніннага попелу. Спецыяльную вопратку трэба замачыць у мыльна-содавым растворы (на вядро вады 50 г соды і кавалак гаспадарчага мыла) на 6—8 гадзін, потым вымыць у гэтым растворы і прапаласкаць спачатку ў гарачай, а затым у цёплай і халоднай вадзе. Гумавыя боты, пальчаткі, забруджаныя ядахімікатамі, трэба памыць у вадзе, затым апрацаваць кашкай хлорнай вапны ці драўніннага попелу, зноў добра памыць у вадзе. Нявыкарыстаныя ядахімікаты трэба заліць на 1—2 сутак растворам кальцыяванай соды (300—500 г на вядро вады), ваду пасля мыцця апаратуры і абясшкоджаныя ядахімікаты выліць у спецыяльна выкапаную яму глыбінёй не менш як 1 *м* і засыпаць зямлёю. Скончыўшы ўсе работы, неабходна вымыць цела цёплай вадой з мылам.

Пры рабоце з ядахімікатамі могуць быць выпадковасці, якія не заўсёды можна прадугледзець. Таму трэба быць гатовымі да гэтага і ўмець своечасова аказаць неабходную першую сама- і ўзаемадапамогу.